**Каранеўская, Т.** Носіць імя Стаселькі / Т. Каранеўская // Ленінская іскра (Сянно). — 1989. — 30 лістап. — С. 3.

## НОСІЦЬ ІМЯ СТАСЕЛЬКІ

Шмат выдатных людзей вырасла на сенненскай зямлі. Сярод іх і імя воіна-інтэрнацыяналіста, загінуўшага ў Афганістане пры выкананні воінскага абавязку, Васіля Іванавіча Стаселькі. Васіль Стаселька – былы вучань школы. І цяпер адзін з піянерскіх атрадаў дружыны носіць яго імя.

Піянеры гэтага атрада правялі вялікую работу, каб заваяваць права насіць імя Стаселькі. Рабяты з’ездзілі на радзіму воіна, у вёску Замошша Обальскага сельсавета, сустрэліся з яго бацькамі, слухалі шчыры расказ маці Васіля, Лідзіі Макараўны і бацькі Івана Сільвестравіча аб сыне, пачыталі яго пісьмы, напісаныя пад гарачым небам Афганістана. Яны бачылі і Грамату, якую Васіль атрымаў у час навучання ў Гродзенскім фізкультурным тэхнікуме, – за спартыўныя дасягненні і выдатную працу ў час сельгасработ, іншыя ўзнагароды.

…У канцы 1982 года Стаселька быў прызваны на службу ў Савецкую Армію. Нёс службу на тэрыторыі Туркменіі, а потым – у Афганістане. Быў паранены, лячыўся ў шпіталі. Адтуль пісаў дадому: «Справы мае ідуць добра, не хвалюйцеся. Хутка сустрэнімся».

Залячыўшы рану ён зноў становіцца ў строй. Але вярнуцца да дому яму не было суджанна. Васіль Іванавіч загінуў. Маці не дачакалася сына, толькі атрымала пісьмо:

«Камандаванне, палітаддзел выказваюць Вам глыбокае спачуванне з выпадку смерці Вашага сына Васіля.

Праходзячы службу на тэрыторыі ДРА, Ваш сын з гонарам выканаў свій інтэрнацыянальны абавязак. За мужнасць і адвагу, арганізаванасць і дысцыпліну, праяўленыя пры выкананні баявых заданняў, ён неаднаразова заахвочваўся камандаваннем часці.

19 чэрвеня 1983 года, выконваючы баявое заданне, верны воінскай прысязе, Васіль цяжка захварэў і памёр. Мы страцілі выдатнага салдата і добрага таварыша. Разам з вамі глыбока смуткуем аб заўчаснай смерці Васіля».

У музеі баявой і працоўнай славы нашай школы ганаровае месца займае стэнд, прысвечаны Васілю Стасельку.

У няпоўныя 20 гадоў ён пайшоў з жыцця, назаўсёды застаўся ў памяці землякоў. Піянеры атрада імя В. І. Стаселькі (дарэчы, гэты атрад шэфствуе над акцябратамі-другакласнікамі, настаўніцай якіх з’яўляецца Іна Іванаўна Блажэвіч. У яе ў свій час вучыўся Васіль) імкнуцца сваімі справамі быць дастойнымі імя загінуўшага земляка. Хутка яны стануць камсамольцамі, а імя свайго атрада, па нашай школьнай традыцыі, перададуць сваім малодшым сябрам – другакласнікам.

На асенніх канікулах піянеры разам з акцябратамі 2-га класа наведалі магілу, дзе пахаваны Васіль, усклалі жывыя кветкі, ушанавалі яго памяць мінутай маўчання.

**Т. Каранеўская,**
**старшая піянерважатая**
**Машканскай сярэдняй школы**